Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
_____________Ю. П. Бондар
«____»____________2012 г.
Рэгістрацыйны № ВД-_____ /вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПЕЎЧЫЯ СТЫЛІ БЕЛАРУСІ
# І СУЧАСНЫ РЭПЕРТУАР НАРОДНАГА СПЕВАКА

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-16 01 10 Спевы (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-16 01 10-01 Спевы (народныя)*

Мінск
БДУКМ
2012

**Складальнік**

*І. М. Грамовіч,* дацэнт кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*А. І. Смагін,* прафесар кафедры культуралогіі прыватнай установы адукацыі «Інстытут сучасных ведаў імя А. М. Шырокава», доктар мастацтвазнаўства, прафесар;

*А. В. Пякуцька,* загадчык кафедры харавога і вакальнага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук, прафесар

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

кафедрай беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 8 ад 22.03. 2012 г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 5 ад 24.05.2012 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *І. М. Грамовіч*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна «Пеўчыя стылі Беларусі і сучасны рэпертуар народнага спевака» займае важнае месца ў навучанні выканаўцаў народнай песні, якая дапамагае падрыхтаваць высокаадукаванага спецыяліста ў вобласці народна-песеннага выканальніцтва.

Выкладанне дысцыпліны базіруецца на ведах, атрыманых студэнтамі пры вывучэнні спецыяльных агульнапрафесійных курсаў, такіх як «Сольныя спевы», «Методыка выкладання сольных спеваў», «Вакальны ансамбль», «Харавы клас», «Выканальніцкае майстэрства», «Расшыфроўка беларускай народнай песні», «Аранжыроўка беларускай народнай песні».

Увасабленне традыцыйных норм выканання ўзораў народна-песеннага мастацтва на сучасным этапе непарыўна звязана з вывучэннем рэгіянальных асаблівасцей беларускай народнай песні. На падставе багатага назапашанага фальклорнага нотнага матэрыялу, фоназапісаў ад носьбітаў народна-песенных традыцый, даследаванняў вядомых беларускіх фалькларыстаў і этнографаў маецца магчымасць вывучэння і аналізу стылявых адметнасцей пеўчых стыляў Беларускага Палесся, Паазер'я, Панямоння, Падняпроўя і Цэнтральнага рэгіёна Беларусі.

*Мэта* дысцыпліны «Пеўчыя стылі Беларусі і сучасны рэпертуар народнага спевака» – азнаёміць студэнтаў з рэгіянальнымі асаблівасцямі беларускага песеннага фальклору, рэгіянальнымі асаблівасцямі мовы, жанраў і стыляў беларускай народнай песні. Даць будучаму спецыялісту веды па засваенні прынцыпаў падбору рэпертуару, асноўных кірункаў працы па назапашванні рэпертуару і дапамагчы знайсці правільны шлях у фарміраванні творчага профілю выканаўцы, яго асабістага рэпертуару і павышэнні мастацкага ўзроўню.

*Задачы* курса:

– раскрыць асноўныя кірункі вывучэння і праблемы захавання народна-песенных традыцый Беларусі;

– паказаць значнасць вывучэння песенных стыляў для авалодання і захавання песенных стыляў;

– авалодаць трывалымі ведамі ў сферы вывучэння ўплыву жанравай, стылявой і моўнай разнастайнасці на выканальніцкую манеру спеваў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– авалоданне тэарэтычнымі ведамі па праблемах і асноўных кірунках фарміравання рэпертуару;

– вывучэнне рэпертуару вядомых выканаўцаў народнай песні;

– знаёмства з методыкай фарміравання рэпертуару на падставе выкарыстання беларускага песеннага фальклору, аўтарскіх твораў;

– вывучэнне твораў для народнага голасу самадзейных і прафесійных кампазітараў.

Выпускнік павінен *ведаць:*

– асаблівасці рэгіянальных песенных стыляў, жанраў, гаворак Беларусі;

– віды шматгалосся;

– прынцыпы падбору рэпертуару;

– методыку і спецыфіку фарміравання рэпертуару народнага спевака;

– мастацкі профіль вядомых выканаўцаў народнай песні;

*умець:*

– абгрунтоўваць свае веды па праблемах вывучэння песеннага фальклору Беларусі;

– разбірацца і вызначаць адметнасці рэгіянальных пеўчых стыляў;

– працаваць з рэпертуарнымі зборнікамі;

– падбіраць рэпертуар для выканаўцаў народнай песні ў адпаведнасці з галасавымі магчымасцямі і акцёрскімі здольнасцямі;

– фарміраваць рэпертуар для правядзення заняткаў, канцэртаў і інш.

Заняткі па дысцыпліне «Пеўчыя стылі Беларусі і сучасны рэпертуар народнага спевака» павінны прывіваць уменні і навыкі, якія б садзейнічалі рознабаковаму развіццю будучага выканаўцы народнай песні, фарміраваць мастацкі густ, павагу да нацыянальных традыцый, выхоўваць творчую асобу, развіваць практычныя навыкі работы з рэпертуарам.

У ліку эфектыўных педагагічных тэхналогій, якія садзейнічаюць развіццю ў студэнтаў крытычнага мыслення, можна вылучыць: вучэбна-даследчую дзейнасць, ролевае і імітацыйнае мадэліраванне, магчымасць творча засвойваць новы вопыт.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэарэтычныя заняткі па дысцыпліне спалучаюцца з самастойнай работай, якая прадугледжвае працу з літаратурай, аўдыязапісамі, нотным матэрыялам.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Пеўчыя стылі Беларусі і сучасны рэпертуар народнага спевака» ўсяго адведзена 84 гадзіны, з якіх 52 гадзіны – аўдыторныя (практычныя) заняткі.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|
| | усяго | практычныя |
| **Раздзел I. Народна-песенны фальклор Беларусі ў сучаснай сістэме духоўнай культуры** | | |
| *Тэма 1.* Асаблівасці традыцый народна-песеннага фальклору Беларусі | 4 | 4 |
| *Тэма 2.* Рэтраспектыўныя формы бытавання беларускага песеннага фальклору і яго сучаснае становішча | 4 | 4 |
| *Тэма 3.* Адлюстраванне рэгіянальнага выканальніцкага стылю ў народнай манеры спеваў | 4 | 4 |
| **Раздзел II. Жанравыя, стылявыя і моўныя асаблівасці выканання песеннага фальклору** | | |
| *Тэма 1.* Пеўчыя стылі Беларускага Паазер'я | 4 | 4 |
| *Тэма 2.* Пеўчыя стылі Беларускага Панямоння | 4 | 4 |
| *Тэма 3.* Пеўчыя стылі Беларускага Падняпроўя | 4 | 4 |
| *Тэма 4.* Пеўчыя стылі Цэнтральнага рэгіёна | 4 | 4 |
| *Тэма 5.* Пеўчыя стылі Брэсцкага і Гомельскага Палесся | 4 | 4 |
| **Раздзел III. Рэпертуар як асноўны сродак творчага профілю выканаўцы народнай песні** | | |
| *Тэма 1.* Рэпертуар вядомых выканаўцаў народнай песні | 4 | 4 |
| *Тэма 2.* Беларускія народныя песні: каляндарна-абрадавыя, пазаабрадавыя, балады | 2 | 2 |
| *Тэма 3.* Сучасныя творы беларускіх кампазітараў для народнага голасу | 2 | 2 |
| **Раздзел IV. Асноўныя кірункі фарміравання рэпертуару выканаўцы народнай песні** | | |
| *Тэма 1.* Прынцыпы фарміравання рэпертуару | 2 | 2 |
| *Тэма 2.* Народныя песні і аўтарскія творы для жаночых і мужчынскіх галасоў | 2 | 2 |
| **Раздзел V. Стварэнне вучэбнага канцэртнага рэпертуару** | | |
| *Тэма 1.* Вучэбны і канцэртны рэпертуар спевака і яго асаблівасці | 4 | 4 |
| *Тэма 2.* Будова канцэртнай праграмы | 4 | 4 |
| **Разам…** | 52 | 52 |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

## Уводзіны

Уводзіны ў прадмет. Задачы і змест дысцыпліны. Метадалогія выкладання, сродкі дыягностыкі. Вучэбна-метадычнае забеспячэнне.

## Раздзел I. Народна-песенны фальклор Беларусі ў сучаснай сістэме духоўнай культуры

### *Тэма 1. Асаблівасці традыцый народна-песеннага фальклору Беларусі*

Народна-песенныя традыцыі як спецыфічная сфера мастацкай дзейнасці. Гістарычнае развіццё аматарскай народна-песеннай творчасці. Праблемы вывучэння беларускага народна-песеннага фальклору. Выканаўцы народнай песні як прапагандысты і захавальнікі фальклорнай спадчыны. Педагагічная значнасць фальклорна-песеннага мастацтва. Роля народна-песенных традыцый у духоўным і творчым развіцці выканаўцаў народнай песні.

### *Тэма 2. Рэтраспектыўныя формы бытавання беларускага песеннага фальклору і яго сучаснае становішча*

Фальклор і фалькларызм. Формы бытавання фальклору. Аналіз сучаснага становішча вывучэння песеннага фальклору. Разгляд розных падыходаў да інтэрпрэтацыі народнай песні.

### *Тэма 3. Адлюстраванне рэгіянальнага выканальніцкага стылю ў народнай манеры спеваў*

Віды шматгалосся. Носьбіты песенных традыцый. Бытавая і акадэмізаваная манера спеваў: асаблівасці і галоўныя характарыстыкі. Сучасныя школы народных спеваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел ІІ. Жанравыя, стылявыя і моўныя асаблівасці выканання песеннага фальклору

### *Тэма 1. Пеўчыя стылі Беларускага Паазер'я*

Песенная культура Паазер'я. Жанравая разнастайнасць і спецыфіка выканання народных песень. Стылявыя выканальніцкія асаблівасці. Адметнасці мясцовай гаворкі і адбітак на манеру выканання.

### *Тэма 2. Пеўчыя стылі Беларускага Панямоння*

Асэнсаванне мясцовай разнастайнасці песеннага фальклору. Значнасць даследавання Т. Б. Варфаламеевай у раскрыцці стылявых асаблівасцей выканання народнай песні Беларускага Панямоння. Рэгіянальная гаворка. Віды шматгалосся.

### *Тэма 3. Пеўчыя стылі Беларускага Падняпроўя*

Песенная культура і разнастайнасць жанраў Беларускага Падняпроўя. Стылявыя і выканальніцкія асаблівасці. Значнасць даследаванняў Т. Б. Варфаламеевай у вызначэнні спецыфікі выканання дадзенага рэгіёна. Асаблівасці мясцовай гаворкі. Віды шматгалосся.

### *Тэма 4. Пеўчыя стылі Цэнтральнага рэгіёна*

Асэнсаванне і вызначэнне жанравай разнастайнасці народнапесенных традыцый рэгіёна. Асаблівасці стылю. Рэгіянальныя гаворкі. Віды шматгалосся.

### *Тэма 5. Пеўчыя стылі Брэсцкага і Гомельскага Палесся*

Песенная культура Гомельскага і Брэсцкага Палесся. Фундаментальныя даследаванні З. Я. Мажэйка асаблівасцей песеннай традыцыі Беларускага Палесся. Дамінуючыя жанры. Стылявыя выканальніцкія асаблівасці. Спецыфіка мясцовай гаворкі. Асаблівасці шматгалосся.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Рэпертуар як асноўны сродак творчага профілю выканаўцы народнай песні

### *Тэма 1. Рэпертуар вядомых выканаўцаў народнай песні*

Асноўная характарыстыка рэпертуару вядомых выканаўцаў народнай песні. Рэпертуар Л. Русланавай, Л. Зыкінай, В. Варанец, М. Мардасавай, Л. Мікалаевай, В. Стрэльчанкі, К. Шаўрынай, Л. Румінай, Ю. Учуватавай, Н. Кадышавай, М. Адамейкі, Г. Аўдзеенкі. Праблемы рэпертуару сучасных выканаўцаў народнай песні.

### *Тэма 2. Беларускія народныя песні: каляндарна-абрадавыя, пазаабрадавыя, балады*

Беларускія каляндарна-абрадавыя песні. Пазаабрадавая лірыка. Жартоўныя беларускія народныя песні. Беларускія балады.

### *Тэма 3. Сучасныя творы беларускіх кампазітараў для народнага голасу*

Творы расійскіх кампазітараў для народнага голасу: Д. Панамарэнка, М. Кутузаў, У. Цямноў. Беларускія кампазітары, іх песенная творчасць: Э. Наско, Л. Захлеўны, А. Балотнік, М. Алешка, М. Сірата, У. Сарокін.

## Раздзел IV. Асноўныя кірункі фарміравання рэпертуару выканаўцы народнай песні

### *Тэма 1. Прынцыпы фарміравання рэпертуару*

Асноўныя прынцыпы фарміравання рэпертуару выканаўцы народнай песні.

Рэпертуар як сродак фарміравання творчай асобы спевака. Разнастайнасць рэпертуару.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 2. Народныя песні і аўтарскія творы для жаночых і мужчынскіх галасоў*

Асаблівасці гучання і дыяпазон жаночых народных галасоў. Асаблівасці гучання і дыяпазон мужчынскіх галасоў. Каляндарна-абрадавыя песні і іх значэнне для фарміравання рэпертуару народнага выканаўцы. Пазаабрадавая лірыка, рэкруцкія і чумацкія песні, беларускія балады – галоўнае звяно ў развіцці творчай асобы выканаўцы. Праблемы фарміравання рэпертуару для мужчынскіх галасоў. Аўтарскія творы і іх значэнне для развіцця вакальна-тэхнічных навыкаў выканаўцы народнай песні.

## Раздзел V. Стварэнне вучэбнага канцэртнага рэпертуару

### *Тэма 1. Вучэбны і канцэртны рэпертуар спевака і яго асаблівасці*

Задачы вучэбнага рэпертуару. Задачы і мэты канцэртнага рэпертуару. Засваенне і адлюстраванне вакальна-тэхнічных навыкаў і развіццё акцёрскага майстэрства.

### *Тэма 2. Будова канцэртнай праграмы*

Асноўныя этапы фарміравання канцэртнай праграмы. Метадычныя ўказанні па падборы рэпертуару для канцэртнай праграмы сольнага канцэрта, зборнага канцэрта, тэматычнага канцэрта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


*Варфаламеева, Т. Б.* Песні Беларускага Панямоння / Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 1980. – 220 с.

*Веснавыя* песні / рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 608 с.

*Вянок* беларускіх народных песень / запіс У. Раговіча. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 432 с.

*Вяселле :* Абрад / уклад. К. А. Цвіркі. – Мінск : Беларус. навука, 2004. – 683 с.

*Дарога* ля жыта : Песні беларус. кампазітараў на вершы В. Жуковіча / уклад. В. А. Жуковіч. – Мінск : Беларусь, 2001. – 144 с.

*Елатов, В. И.* Песни восточнославянской общности / В. И. Елатов. – Минск : Наука и техника, 1977. – 245 с.

*Жартоўныя* песні / рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 340 с.

*Жніўныя* песні / рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1974. – 348 с.

*Кузняцоў, І. І.* Звіняць над краем песні / І. І. Кузняцоў. – Мінск : Беларусь, 1979. – 79 с.

*Мажэйка, З. Я.* Песні Беларускага Паазер’я / З. Я. Мажэйка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 493 с.

*Мажэйка, З. Я.* Песні Беларускага Падняпроўя / З. Я. Мажэйка, Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 276 с.

*Можейко, З. Я.* Песни Белорусского Полесья / З. Я. Можейко. – М. : Сов. композитор, 1983. – Вып. 1. – 184 с.

*Можейко, З. Я.* Песни Белорусского Полесья / З. Я. Можейко. – М. : Сов. композитор, 1984. – Вып. 2. – 181 с.

*Песні* Беласточчыны /А. С. Фядосік. – Мінск : Беларус. навука, 1997. – 237 с.

*Раговіч, У. І.* Песенны фальклор Палесся. Песні святочнага календара / У. І. Раговіч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2001. – Т. 1. – 526 с.

*Русские* песни из репертуара Л. Руслановой ; сост. Н. Кольцова. – М. : Музыка, 1973. – 95 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Салавей* спявае / уклад. С. К. Ярохіна. – Мінск : Беларусь, 1990. – 160 с.

*Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў. Магілёўскае Падняпроўе / уклад. Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – Т. 1. – 796 с.

*Холупава, Л. І.* Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль : вучэб. дапам. / Л. І. Холупава, І. М. Грамовіч, Л. Л. Ражкова. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. –189 с.

*У карагодзе* мы былі. Беларускія народныя танцавальныя песні / уклад. М. А. Козенка. – Мінск : БелІПК, 1988. – 112 с.

*Вучэбна-метадычная*

*Калугина, Н. В.* Вопросы формирования репертуара самодеятельного народного хора / Н. В. Калугина. – М., 1980. – 51 с.

*Калугина, Н. В.* Методика работы с русским народным хором: учебник для муз. вузов / Н. В. Калугина. – М. : Музыка, 1977. – 256 с.

*Мешко, Н. К.* Искусство народного пения. Практическое руководство и методика обучения искусству народного пения / Н. К. Мешко. – М. : ЛУЧ, 2000. – Ч. 2. – 80 с.

*Руднева, А. В.* Русский народный хор и работа с ним / А. В. Руднева. – М. : Сов. Россия, 1974. – 49 с.

*Савельева, В. П.* Проблемы вокального обучения руководителей народных хоров / В. П. Савельева // Вопросы хорового образования : сб. тр. / М-во культуры РСФСР, Гос. муз.-пед. ин-т. – М., 1985. – Вып. 77. – 120 с.

*Шамина, Л. В.* Работа с самодеятельным хоровым коллективом / Л. В. Шамина. – М. : Музыка, 1983. – 176 с.

*Дадатковая*

*Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / уклад. В. А. Захарава, Р. М. Кавалёва, В. Д. Ліцвінка. – Мінск : Універсітэцкае, 1989. – 384 с.

*Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / уклад. В. Д. Ліцвінка, Г. Д. Кутырова. – Мінск : Універсітэцкае, 1995. – 250 с.

*Беларускія* народныя танцавальныя песні. Рэпертуарны зборнік / уклад. М. А. Козенка. – Мінск : БелІПК, 1988. – 112 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Варфоломеева, Т. Б.* Северобелорусская свадьба / Т. Б. Варфоломеева. – Минск : Наука и техника, 1988. – 154 с.

*Гульні,* забавы, ігрышчы / уклад. А. Ю. Лозкі. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – 534 с.

*Чурко, Ю. М.* Белорусский хореографический фольклор / Ю. М. Чурко. – Минск : Выш. шк., 1990. – 413 с.

## Сродкі дыягностыкі

Для кантролю і самакантролю ведаў студэнтаў выкарыстоўваецца дыягнастычны інструментарый, які мае рознаўзроўневы характар і ўжываецца комплексна:

– творчыя заданні, якія прадугледжваюць назапашванне фальклорнага матэрыялу, нотнага матэрыялу па запланаваных тэмах дысцыпліны;

– вуснае апытанне сабранага студэнтамі фактычнага матэрыялу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ПЕЎЧЫЯ СТЫЛІ БЕЛАРУСІ**
**І СУЧАСНЫ РЭПЕРТУАР НАРОДНАГА СПЕВАКА**

*Вучэбная праграма*
*па спецыяльнасці 1-16 01 10 Спевы (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-16 01 10-01 Спевы (народныя)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2012. Фармат 60x84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,82. Ул.-выд. арк. 0,39. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ